**Гарбачоў, М.** Снайперскі лёс / М. Гарбачоў // Лепельскі край. — 2014. — 28 крас. — С. 6.

## СНАЙПЕРСКІ ЛЁС

Ці здагадваўся Аляксандр Аўтушка, калі яго ў 1986 годзе ў першы раз выклікалі ў ваенкамат, каб накіраваць на тэрміновую ваенную службу, што ён трапіць са звыклага паўсядзённага мірнага жыцця ў Домжарыцах у чужую і незнаёмую яму краіну, Афганістан, на сапраўдную вайну з баявой стральбой і магчымасцю ў любы момант загінуць?! Канечне ж, ён не мог сабе гэтага ўявіць нават у самым страшным, кашмарным сне. І адразу дзесьці вельмі далёка ў мінулым засталіся яго бацькі, трое братоў і сястра, іншыя родныя людзі, якія спачатку нават і не падазравалі, што ён аказаўся ў самым пекле вайны, на фронце, на самай перадавой лініі, удзельнічае ў баявых дзеяннях са зброяй у руках. А прама перад ім у гэты час знаходзіўся люты і бязлітасны вораг.

Пашчасціла Аляксандру Віктаравічу толькі ў тым, што перад самым накіраваннем ў Афганістан ён яшчэ паўгода авалодваў тэарэтычнымі ведамі і набываў практычныя навыкі ваеннага спайпера ў «вучэбцы» ў Фергане (Узбекістан).

– Так што ўжо ў першым баі з душманамі я быў не жаўтаротым птушаняці, а спрактыкаваным стралком са снайперскай вінтоўкай Драгунова, якая дазваляе весці прыцэльны агонь па ворагу на адлегласці ў 800 метраў з убойнай сілай палёту кулі не менш з 1200 метраў, – сказаў Аляксандр Аўтушка. – Трапіў у 57-ы полк Віцебскай паветрана-дэсантнай дывізіі, які вёў баявыя дзеянні ў правінцыі Баміан. Гэтая мясцовасць уяўляе сабой даліну сярод гор. Любы стрэл у ёй адгукаўся доўгім рэхам па наваколлі.

У сувязі з асаблівасцю горнага рэльефу душманы мелі магчымасць вельмі блізка падабрацца да нашых пазіцый. Даводзілася БМП, іншую ваенную тэхніку закопваць у зямлю, каб зменшыць верагоднасць яе знішчэння гранатамётамі, іншымі сродкамі паражэння. Каб захаваць сваё ўласнае жыццё, не трапіць пад кулі душманаў, выкопвалі ў зямлі глыбокія суцэльныя траншэі, як гэта рабілі ў свій час франтавікі ў гады Вялікай Айчыннай вайны, а на брустверах асобныя агнявыя пазіцыі ўмацоўвалі мяшкамі з пяском.

– У якія месцы Афганістана кідаў ваенны лёс?

– За паўтара года службы разам з баявымі сябрамі ваяваў на большай частцы тэрыторыі гэтай краіны. Некалькі месяцаў знаходзіўся ў Цёплым Стане на ўскраіне Кабула. Вырашаў баявыя задачы і ў непасрэднай блізкасці ад былой рэзідзенцыі Аміна. Займаўся аховай разнастайных ваенных аб’ектаў. Удзельнічаў у засадах, знішчэнні воінскіх злучэнняў ворага. Неаднойчы перахопліваў караваны са зброяй, адрасаванай душманам, што прыбывалі з Пакістана.

– Калі вярнуўся дадому?

– Вясной 1988 года быў звольнены ў запас і пакінуў Афганістан на самалёце.

**Мікалай Гарбачоў**